З першых вуснаў

# «УРАЧ ПАВІНЕН БЫЦЬ САМЫМ ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ЧАЛАВЕКАМ»

## Новыя кіраўнікі для ВНУ, Мінфіна і Дзяржкамітэта па маёмасці — кадравы панядзелак у Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі

Паводле паведамлення прэс-службы Прэзідэнта ўчора кіраўнік дзяржавы назначыў **Вячаслава ДАНІЛОВІЧА рэктарам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь** і даў згоду на назначэнне **Сяргея РУБНІКОВІЧА рэктарам Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Ігара СТОМЫ рэктарам Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Алены КРАТКОВАЙ рэктарам Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.** Прэзідэнт таксама ўзгадніў назначэнне **Сяргея НІКІФАРОВІЧА генеральным дырэктарам ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючай кампаніі холдынга «БЕЛАЗ-Холдынг», Аляксандра ТАРАСЕНКІ намеснікам міністра аховы здароўя — галоўным дзяржаўным санітарным урачом Рэспублікі Беларусь, Дзмітрыя КІЙКО першым намеснікам міністра фінансаў, Алену ПЕЧАНЬ і Вольгу ТАРАСЕВІЧ намеснікамі міністра фінансаў. Пётр БРОЎКІН** узгоднены Аляксандрам Лукашэнкам на **пасаду першага намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, Мікалай БАБЕР — намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці,** а **Анатоль УЛАСЕВІЧ — першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама.**

Узгадняючы назначэнне рэктараў, кіраўнік дзяржавы заявіў, што ў беларускіх ВНУ трэба звярнуць увагу на выхаваўчы працэс. «Мы даём бліскучую адукацыю. Нашы спецыялісты, якія атрымалі адукацыю ў Беларусі, цэняцца ва ўсім свеце», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба.

У той жа час, звярнуў увагу Прэзідэнт, апошнія некалькі гадоў назіраецца адваротны працэс: у Беларусь вяртаюцца людзі, якія некалі паехалі жыць і працаваць у іншыя краіны. «У нашым свеце наўрад ці некага ўтрымаеш сёння. Утрымліваць трэба разумна, каб людзі цанілі гэту зямлю. А Акадэмія кіравання — там наогул мыш не павінна прапаўзці, там павінны быць патрыятычныя і адданыя дзяржаве і народу людзі. Я спецыяльна папрасіў, каб гуманітарный узначальваў гэту ВНУ. ***Нам вельмі не хапае патрыятызму ў нашых людзях***», — лічыць Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта актуальна і для медыцынскіх ВНУ, паколькі яны «зацыкленыя на сваёй канкрэтнай справе».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што гэтымі днямі, як яму далажылі, у адной з паліклінік урач адмовіўся лячыць трохгадовае дзіця ваеннага. Прэзідэнт абурыўся гэтай сітуацыяй і даручыў разабрацца ў ёй. «У гады вайны мы ворагаў сваіх лячылі, калі пападаўся на полі бою. А гэта што ж за ўрачы? Вось прычына таго, што я даручыў уважліва пагладзець на кіраўніцтва нашых медыцынскіх ВНУ. ***Урач павінен быць самым патрыятычным чалавекам, таму што яго галоўная задача — ратаваць жыццё любога чалавека***», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы таксама згадаў пра яшчэ адзін нядаўні выпадак, калі ў Смалявічах мужчына падпаліў сябе каля будынка РАУС. Паводле яго слоў, сітуацыя з лячэннем гэтага чалавека была адваротнай. «Мы ж яго перавезлі ледзь жывога ў апёкавы цэнтр і лечым, таму што гэта чалавек», — сказаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што ***ўрачы, як і настаўнікі, — гэта аснова грамадства, і яго стаўленне да іх заўсёды было асаблівае.*** «Я вас вельмі прашу: звярніце ўвагу не толькі на адукацыйны, але і на выхаваўчы працэс у тых ВНУ, у якія вы накіроўваецеся», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ва ўрадзе

# Рэгіёны як фундамент эканамічных адносін

**«Не заканчваюцца спробы прамога ўмяшальніцтва ў нашы ўнутраныя справы». Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас сустрэчы з губернатарам Прыморскага краю Расіі Алегам КАЖАМЯКАМ.**

«Як у ходзе перадвыбарчай кампаніі ў Рэспубліцы Беларусь, так і пасля яе, наша краіна сутыкнулася з беспрэцэдэнтным знешнім ціскам. Не заканчваюцца спробы прамога ўмяшальніцтва ў нашы ўнутраныя справы. Не заканчваюцца спробы расхістаць сітуацыю, дэстабілізаваць абстаноўку ў краіне, ператварыць яе ў хаос, якога дабіваюцца злоснікі нашай краіны», — сказаў кіраўнік урада.

Па яго словах, у гэтых умовах асабліва важная падтрымка сяброў, таму ён падкрэсліў каштоўнасць беларуска-расійскіх адносін і інтэнсіфікацыю двухбаковых кантактаў. У іх шэрагу — візіт у Мінск у пачатку месяца прэм'ера Расіі Міхаіла Мішусціна, сустрэча двух прэзідэнтаў у Сочы.

«У яго ходзе (візіту ў Сочы. — **Зв.**) была падкрэслена абодвума бакамі неабходнасць інтэнсіфікацыі рэгіянальнага супрацоўніцтва, актывізацыя прамых кантактаў паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі. Лідары нашых дзяржаў дамовіліся актывізаваць супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі як фундамент эканамічных адносін», — дадаў Раман Галоўчанка.

Ён таксама адзначыў, што на мінулых пасадах Алег Кажамяка велізарную ўвагу аддаваў супрацоўніцтву з Беларуссю. Калі ён быў губернатарам Амурскай вобласці, заснавана зборачная вытворчасць айчынных камбайнаў, а ў бытнасць губернатарам Сахалінскай вобласці экспарт беларускай прадукцыі машынабудавання туды вырас у 16 разоў у першую чаргу за кошт кар'ерных самазвалаў.

«І сёння Прыморскі край для Беларусі — адзін з ключавых партнёраў у Далёкаўсходняй федэральнай акрузе. У 2019 годзе наш тавараабарот павялічыўся на 8,4 працэнта, а ў студзені—ліпені сёлета ўжо на 17,7 працэнта. У якасці губернатара Прыморскага краю вы тэндэнцыю захоўваеце, чаму мы вельмі рады», — падкрэсліў беларускі прэ'мер.

Ён працягнуў, што на гэтым нельга спыняцца і развіваць садзейнічанне неабходна, у першую чаргу, у прамысловасці.

«У вас вельмі багаты край карыснымі выкапнямі, прыроднымі рэсурсамі, унікальная зямля, таму мы, нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, ганарымся тым, што прысутнічаем у гэтым выдатным краі зямлі і робім свой унёсак у яго прамыслова-індустрыяльнае развіццё», — канстатаваў Раман Галоўчанка і адзначыў, што хоча пачуць праекты і ідэі, з якімі прыехаў губернатар.

На думку Рамана Галоўчанкі, неабходна актыўна працаваць над стварэннем гандлёвых кантактаў, у экалагічнай сферы.

Па словах Алега Кажамякі, яго візіт падтрымліваюць жыхары Прымор'я, бо прадукцыя беларускіх вытворцаў выклікае павагу за высокую якасць.

«Таму, канешне, мы зацікаўлены ў супрацоўніцтве, у пастаўках у машынабудаванні, рэалізацыі тавараў спажывання, якія сёння Прыморскі край не можа сам ствараць. Я думаю, што тыя невялікія таварныя адносіны і ў экспарце, і ў імпарце могуць быць значна павялічаны», — заявіў губернатар.

Дэлегацыя з Расіі, у складзе якой кіраўнікі рэгіянальных міністэрстваў, мэр Уладзівастока, ужо азнаёміліся з прадпрыемствамі Гомельскай, Магілёўскай абласцей. Працягваюцца візіты і сёння. Найбольш зацікавілі іх магчымасці пастаўкі беларускіх аўтобусаў трэцяга пакалення.

**Марыя ДАДАЛКА.**

«За мір»

## Маштабны аўтапрабег зладзілі аўтааматары па вуліцах Брэста

**Удзельнікі аўтапрабегу ўсклалі кветкі да Вечнага агню на плошчы Цырыманіялаў Брэсцкай крэпасці, а потым хвілінай маўчання ўшанавалі памяць абаронцаў Айчыны, якія ў гады вайны адстойвалі наша права на мірнае і спакойнае жыццё.**

У мінулую пятніцу ў Брэсце адбыўся аўтапрабег пад назвай «Мы — за мір». На машыны селі ветэраны вайны і працы, прадстаўнікі працоўных калектываў, маладыя і дарослыя людзі. У аўтапрабегу паўдзельнічаў **намеснік старшыні гарвыканкама Віталь ШЧЭРБА**. Месцам для старту стала пляцоўка Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па гульнявых відах спорту «Вікторыя». Адсюль дзве сотні машын накіраваліся ў шлях, які ўдзельнікі маршу прысвяцілі абаронцам Радзімы і міру ў нашай краіне. Яны праехалі па вуліцах Гродзенскай, Маскоўскай, праспекце Машэрава, далей павярнулі на Леніна да Заходняга абходу і фінішавалі ў Брэсцкай крэпасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Ваенная бяспека

## ДРУГІ ЭТАП ВУЧЭННЯЎ

**Сёння пачынаецца другі этап сумесных беларуска-расійскіх вучэнняў «Славянскае братэрства — 2020». У прэс-службе Міністэрства абароны расказалі аб тым, як ён будзе праходзіць.**

Практычныя дзеянні войскаў будуць скіраваны на вядзенне сумесных дзеянняў для захавання ваеннай бяспекі дзяржавы. У вучэннях будуць удзельнічаць вайскоўцы Заходняга аператыўнага камандавання, сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл, Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны, ракетных войскаў і артылерыі, а таксама падраздзяленні двух злучэнняў паветрана-дэсантных войскаў Узброеных Сіл Расіі. Агулам будзе задзейнічана каля шасці тысяч вайскоўцаў, звыш 500 адзінак баявой тэхнікі. Пры гэтым ад Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі — каля 1000 чалавек і да 100 адзінак баявой тэхнікі.

— Сумесныя вучэнні «Славянскае братэрства — 2020» маюць абарончы характар і накіраваны на адпрацоўку сумесных дзеянняў груповак войскаў у адпаведнасці з існуючымі дамоўленасцямі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, а таксама далейшае ўмацаванне і развіццё інтэграцыйных працэсаў у рамках умацавання абараназдольнасці Саюзнай дзяржавы, — адзначылі ў Мінабароны.

Кіраваць вучэннямі будзе намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Сяргей Патапенка.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Генсек ААН назваў прыярытэтамі стварэнне вакцыны ад каранавіруса і барацьбу за экалогію



Стварэнне вакцыны ад «ковіду» і зніжэнне маштабаў выкідаў у атмасферу вуглякіслага газу — дзве важныя праблемы, якімі міжнароднай супольнасці трэба будзе займацца ў найбліжэйшы час. Пра гэта заявіў напярэдадні пачатку агульнапалітычнай дыскусіі на 75-й сесіі Генеральнай Асамблеі генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш у інтэрв'ю тэлекампаніі PBS. Генсек таксама лічыць, што амерыкана-кітайскія супярэчнасці могуць прывесці да сур'ёзных праблем у аглядной будучыні: «Я сказаў бы, што існуе рызыка, але мы яшчэ не дасягнулі гэтай стадыі, мы ўсё яшчэ на этапе, калі сітуацыя непрадказальная і трэба пагладзець, што адбудзецца ў найбліжэйшыя два-тры гады, з тым каб мець больш выразную перспектыву». На думку генеральнага сакратара ААН, «рызыка ў тым, што дзве эканомікі будуць дзейнічаць па сваіх правілах у гандлі, будзе два інтэрнэты, дзве розныя стратэгіі стварэння штучнага інтэлекту, дзве дамінуючыя валюты». У выніку, падкрэсліў Гутэрыш, «можа ўзнікнуць пагроза канфрантацыі, якая стане вельмі сур'ёзнай».

## Брытанскім парушальнікам самаізаляцыі пагражае штраф у 10 тысяч фунтаў




Улады Вялікабрытаніі ўводзяць больш строгія пакаранні за парушэнні каранавірусных абмежаванняў, паведамляе «Бі-бі-сі». Напрыклад, у Англіі, дзе сітуацыя асабліва сур'ёзная, пачынаючы з 28 верасня штраф за парушэнне самаізаляцыі можа скласці 10 тысяч фунтаў (амаль $13 тыс.). Ён закране грамадзян, у якіх пацверджаны COVID-19 або якія былі ў блізкім кантакце з хворымі, але не выконваюць самаізаляцыю. Пачынацца штрафы будуць ад тысячы фунтаў, 10 тысяч — гэта максімальная сума для тых, хто парушыць забарону шматкроць або для самых абуральных выпадкаў ігнаравання патрабавання самаізаляцыі. Міністр аховы здароўя Вялікабрытаніі Мэт Хэнкок, якога цытуе Daily Mail, заявіў, што брытанцы павінны заяўляць у паліцыю, калі іх суседзі парушаюць каранавірусныя абмежаванні. Паводле яго слоў, ён сам зрабіў бы менавіта так. Паведамляецца, што ў Англіі і Уэльсе было выпісана больш за 19 тысяч штрафаў за парушэнні абмежаванняў, але аплачана менш за палову з іх. Як адзначае «Бі-бі-сі», улады краіны разглядаюць магчымасць скарацiць гадзіны работы пабаў і ўвесці абмежаванні на сустрэчы людзей, якія не пражываюць разам.

## Каля Каіра знайшлі 27 саркафагаў узростам больш за 2500 гадоў



Раней улады Егіпта аб'яўлялі, што на месцы раскопак знойдзены 13 саркафагаў, затым былі выяўленыя яшчэ 14. Эксперты называюць гэта адкрыццё найбуйнейшым у сваім родзе. Сакара, якая знаходзіцца за 30 кіламетраў ад Каіра, 3000 гадоў назад актыўна выкарыстоўвалася для пахаванняў і была галоўным некропалем Мемфіса — сталіцы Старажытнага Егіпта. Цяпер яна адносіцца да Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Міністэрства па справах старажытнасцяў Егіпта паведамляе, што саркафагі не адчыняліся з моманту пахавання. Работы на месцы працягваюцца, археолагі вядуць даследаванні на глыбіні 11 метраў. Яны спадзяюцца атрымаць больш даных аб тым, каму належаць саркафагі.